

УДК 902(476)

**Дзяніс ДУК**

*Рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар.*

*Сфера навуковых інтарэсаў: археалогія і гісторыя Полацка і Полацкай зямлі.*

*Аўтар шэрагу манаграфій, у тым ліку “Полацк у святле станаўлення гістарычных і нацыянальных форм беларускай дзяржаўнасці (IX–XX стст.)” (Магілёў, 2019, у суаўтарстве), “Виталитивная культура населения Полоцка (по данным актовых книг магистрата 1656—1657, 1676, 1727 гг. и ревизии 1765 г.)” (Могилев, 2021), “Полацк і палачане (IX—XVIII стст.)” (Наваполацк, 2010), “Археалагічныя комплексы пасадаў Полацка IX—XVIII стст. (па выніках раскопак 2004—2012 гг.)” (Наваполацк, 2014), раздзелаў калектыўнай навуковай працы “Полоцк” з серыі “Древнейшие города Беларуси” (Мінск, 2012) і больш чым 160 навуковых публікацый. Лаўрэат прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2013).*

# Асноўныя дасягненні полацкай археалогіі на старонках “Беларускага гістарычнага часопіса”:

## *здабыткі і падставы для дыскусій*

**На старонках “Беларускага гістарычнага часопіса” — аднаго з першых аўтарытэтных навуковых гістарычных выданняў суверэннай Беларусі — склалася ўстойлівая традыцыя публікацый найбольш значных адкрыццяў полацкай археалогіі. Многія з іх зроблены аўтарам дадзеных радкоў і былі падрыхтаваны для шырокай чытацкай аўдыторыі, што называецца, “адразу з печы” археалагічных раскопак. Такая практыка дазволіла часопісу данесці навіну аб навуковых адкрыццях ад першых асоб, кіраўнікоў археалагічных экспедыцый, паколькі ў полацкай археалогіі кожнае адкрыццё пашырае нашае ўсведамленне пачаткаў беларускай дзяржаўнасці.**

**Ключавыя словы**: *Полацк, Полацкая Русь, археалогія, гістарыяграфія, гісторыя беларускай дзяржаўнасці, гістарычныя крыніцы*

Гістарыяграфічны агляд, прадстаўлены ў дадзеным артыкуле, ставіць некалькі мэтаў. Першая мэта — з сучасных пазіцый і паводле наяўнай крыніцазнаўчай базы ахарактарызаваць стан і перспектывы археалагічнага вывучэння Полацка, абазначыць дыскусійныя пытанні генезісу полацкай дзяржаўнасці і прадставіць аўтарскае бачанне іх вырашэння. Другая мэта — гэта знаёмства чытача з дынамікай зменаў нашых уяўленняў аб ролі і месцы Полацка ў дзяржаватворчых працэсах на тэрыторыі Беларусі паводле археалагічных адкрыццяў.

### *Навуковы археалагічны патэнцыял Полацкай зямлі*

У канцы 1990-х гг. у беларускай археалогіі склалася парадаксальная сітуацыя, калі пры наяўнасці ў вядучай дзяржаўнай навуковай установе краіны — Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — асобнага аддзела па вывучэнні Полацка і Полацкай зямлі палявых археалагічных даследаванняў у Полацку фактычна не праводзілася. Гэтая праблема вельмі непакоіла тагачаснага кіраўніка аддзела, аўтарытэтнага даследчыка Полацка, доктара гістарычных навук, прафесара Г.В.Штыхава. З яго вуснаў не аднойчы можна было пачуць: *“У Полацку павінен быць археолаг!”* Гэты прынцыповы, на думку Георгія Васільевіча, тэзіс азначаў, што археолаг павінен жыць і працаваць менавіта ў Полацку і арганізоўваць палявыя археалагічныя даследаванні. На той час гэтую мэту можна было рэалізаваць на базе дзвюх устаноў — Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Шматгадовая практыка ў той час вызначала перавагу гісторыка-культурнага запаведніка ў гэтым умоўным “спаборніцтве”. Менавіта запаведнік дагэтуль з’яўляўся базай для археалагічных даследаванняў у Полацку. Аднак у 1990-я гг. на Полаччыне дзейнічала яшчэ адна навуковая ўстанова — Полацкі дзяржаўны універсітэт, у якім у 1994 г. была адкрыта спецыяльнасць “Гісторыя” і ажыццёўлены першы набор студэнтаў. Сёння стала добра зразумелай геніяльная задума першага рэктара ўніверсітэта, доктара тэхнічных навук, прафесара Э.М.Бабенкі аб аб’яднанні навуковага патэнцыялу дзвюх розных устаноў, якія рабілі адну вельмі патрэбную маладой суверэннай краіне справу. Час паказаў выдатныя поспехі і плён такога ўзаемадзеяння. Менавіта Полацкі дзяржаўны універсітэт з 2000 г. стаў базай штогадовых археалагічных экспедыцый.

У 2012 г. на базе Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта была праведзена маштабная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 1150-годдзю Полацка. На той час у Полацку ўжо працавала плеяда археолагаў, выпускнікоў гісторыка-філалагічнага факультэта, пачынаючы з аўтара гэтага артыкула і з 2011 г. — доктара гістарычных навук. Навукоўцы-археолагі і дагэтуль працуюць ва ўніверсітэце і ў запаведніку і актыўна займаюцца палявым вывучэннем Полацка і Полацкай зямлі. Сярод іх — Аляксей Коц, Ігар Магалінскі, Аляксандр Салаўёў, Віктар Чараўко, пры гэтым І.Магалінскі і В.Чараўко абаранілі кандыдацкія дысертацыі па спецыяльнасці “Археалогія”.



*Выгляд полацкага гарадзішча з паўночнага боку. 2007 г. Фота М.Гальпяровіча.*



*Полацкае гарадзішча, засыпанне раскопу. Злева — Аляксей Коц. 2007 г.*




*Полацк у гісторыі і культуры Еўропы (матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі). Полацк, 2012 г.*

У 2015 г. па хадайніцтве кіраўніцтва Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра і па даручэнні Намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Н.І.Качанавай у Полацку пачынаецца комплексная рэстаўрацыя Спаса-Праабражэнскай царквы. Дагэтуль пытанні рэстаўрацыі адзінага цалкам захаванага помніка полацкай школы дойлідства XII ст. не вырашалася на працягу многіх гадоў. Гэтыя работы прадугледжвалі распрацоўку дэталёвага праекта, дзеля чаго неабходна было правесці археалагічныя даследаванні. У выніку дзейнасці сумеснай экспедыцыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (Рэспубліка Беларусь) і Дзяржаўнага Эрмітажа (Расійская Федэрацыя) былі зроблены важныя археалагічныя знаходкі. Сярод іх — адкрыццё дзвюх пячатак Еўфрасінні Полацкай, асабістай як духоўнай асобы і асветніцы, і парадной — як ігуменні вядомага на ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі і Візантыі тагачаснага Спаскага манастыра [1; 2]. Гэтыя пячаткі дазволілі атрымаць дадатковыя звесткі аб статусе полацкага Спаскага манастыра і яго ігуменні Еўфрасінні ў сістэме палітычных і культурных сувязяў Старажытнай Русі і Візантыі.



*Пячатка Еўфрасінні Полацкай, знойдзеная ў часе археалагічных даследаванняў Спаса-Праабражэнскай царквы ў 2015 г.*

Не менш важкім дзякуючы археалагічным раскопкам стала вызначэнне задумы Еўфрасінні па пачатковым выглядзе Спаскай царквы XII ст. Адкрытыя



*Полацкае гарадзішча. Пласт пажарышча (унізе), з якога атрымана радыевугляроднае датаванне і ў якім знойдзена ляпная кераміка канца VIII ст. 2007 г.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пад час раскопак галерэі дазволілі па-новаму вызначыць пытанні рэканструкцыі і знешняга выгляду храма, а наяўнасць асобнай падземнай царквы-пахавальні ў гонар бацькі Еўфрасінні, Святога князя Георгія, з'яўляецца ўнікальнай з'явай у культавай архітэктуры на тэрыторыі Старажытнай Русі [3; 4; 5, с. 32—39]. Практычным вынікам усяго комплексу прац стала рэалізаваная дзяржаўная праграма рэстаўрацыі і кансервацыі Спаса-Праабражэнскай царквы.

Напэўна, самае палемічнае пытанне ў археалогіі Полацка XX — пачатку XXI ст. — гэта вызначэнне статусу першапачатковага гарадзішча і Верхняга замка. У 1928 г. таленавіты беларускі археолаг А.М.Ляўданскі лічыў старажытнае полацкае гарадзішча месцам пачаткаў летапіснага Полацка. Гэтая думка пазней была аспрэчаная археолагамі Э.М.Загарульскім і А.Р.Мітрафанавым, якія лічылі Верхні замак месцам пачатковай лакалізацыі княжацкага двара. Аднак большасць археолагаў, даследчыкаў Полацка, падтрымалі меркаванне А.М.Ляўданскага. Сярод іх — В.Р.Тарасенка, Г.В.Штыхаў і С.В.Тарасаў. Нашыя раскопкі на полацкім гарадзішчы пераканаўча паказалі, што на гэтым помніку археалогіі ў IX—X стст. былі ўсе атрыбуты пачатковага "града", а ў XI—XII стст. тут мог размяшчацца княжацкі двор. Доказам з'яўляецца знойдзены намі багаты комплекс рэчаў элітарнай культуры меркаванага княжага двара са слядамі вытворчых комплексаў зброевай і ювелірнай майстэрань [6; 7].

Што тычыцца Верхняга замка, то наяўная крыніцазнаўчая база да 2020 г. не дазваляла вызначыць яго статус у перыяд замацавання і роскviту княжацкай улады Рагвалодавічаў у XI ст. Намі была звернута ўвага на адсутнасць археалагічных сведчанняў пра абарончыя ўмацаванні XI—XIII стст. на Верхнім замку і недастатковы стан вывучэння помнікаў архітэктуры XII ст. на ім, у прыватнасці, пастаўлены пад сумненне час узвядзення княжацкага церама ў XII ст. [8]. Зняць гэтыя праблемныя пытанні магчыма было толькі праз пошук новых археалагічных крыніц, а ўсё гэта патрабавала маштабных палявых археалагічных даследаванняў.

Такая нагода з'явілася ў 2019—2022 гг., калі пачалася рэалізацыя дзяржаўнай праграмы па рэканструкцыі будынкаў Верхняга замка. Будаўніцтва на ўсіх этапах суправаджалі археалагічныя даследаванні, у выніку чаго ў археолагаў з'явілася ўнікальная магчымасць прасачыць стратыграфію большай часткі Верхняга замка і правесці маштабныя археалагічныя раскопкі і нагляд за культурнымі напластаваннямі на вялікай тэрыторыі. Гэтыя даследаванні праводзіліся супрацоўнікамі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (кіраўнікі В.Ляўко і М.Клімаў) і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (І.Магалінскі). Вынікі даследаванняў яшчэ не апублікаваныя, але папярэдне можна казаць аб адкрыцці і першасным даследаванні ўмацаванняў Верхняга замка "княжацкага" перыяду.



*Свінцовая віслая пячатка вікарыя Канстанціна з горада Керамаса, епархія горада Афрадзісіаса (з раскопак полацкага Вялікага пасада 2005 г.). Візантыя, XII ст.*

Археалагічныя працы на Верхнім замку ў 2019—2022 гг. стаяць у шэрагу падобных даследаванняў, наўпрост звязаных з вялікімі будоўлямі ў Полацку розных аб'ектаў. Так, маштабныя археалагічныя раскопкі праводзіліся савецкімі археолагамі на Верхнім замку ў 1950—1960-я гг. пад час узвядзення будынкаў гарадской бальніцы. Тады вынікам праведзенага комплексу археалагічных прац стала абарона кандыдацкай дысертацыі Г.Штыхава, якая пазней у дапрацаваным выглядзе прадстаўлена ў манаграфіі "*Старажытны Полацк*" [9]. Аналагічная сітуацыя склалася ў Полацку ў 1987—1988 гг., калі выратавальныя раскопкі на Вялікім пасадзе праводзіліся ў ходзе будаўніцтва шматпавярховага дома. Вынік раскопак, якія перавышалі 1200 кв. м, адлюстраваны ў абароненай кандыдацкай дысертацыі і навуковых публікацыях С.Тарасава [10]. Таму няма сумненняў, што вынікі сучасных археалагічных даследаванняў археалагічных помнікаў Верхняга замка, сярод якіх княжацкі храм і церам XII ст., будуць падставай для новых навуковых высноў і, спадзяемся, новых абароненых дысертацый.

Адзначым яшчэ адну важную акалічнасць. Многія са згаданых археалагічных адкрыццяў зрабіліся магчымымі дзякуючы сацыяльна-эканамічным праектам, ініцыятарам якіх выступаюць інстытуты дзяржаўнай улады і іх кіраўнікі. Згаданы прыклад прамога даручэння Намесніка Прэм'ер-міністра па рэканструкцыі Спаса-Праабражэнскай царквы ў 2015 г. не адзінкавы. Так, ініцыятыву полацкіх уладаў па рэканструкцыі Верхняга замка ў 2018 г. актыўна падтрымаў на той час кіраўнік Міністэрства адукацыі і колішні выпускнік СШ № 14 г. Полацка І.В.Карпенка. Дзякуючы яго ўдзелу быў распрацаваны праект прыстасавання будынкаў Верхняга замка пад патрэбы кадэцкага корпуса, і неўзабаве пачаліся маштабныя працы па іх рэканструкцыі і будаўніцтве новых аб'ектаў інфраструктуры.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



*Выратавальныя раскопкі на Вялікім пасадзе Полацка. 2005 г.*

Электронный архив библиотеки

## *Пытанні генезісу полацкай дзяржаўнасці*

Святкаванне 1150-гадовага юбілею Полацка супала з аналагічным па часе юбілеем расійскай дзяржаўнасці, паколькі летапісная дата 862 г. аб'яднала пачатак летазлічэння Ноўгарада (дакладней, яго прадцечы на Рурыкавым гарадзішчы), Полацка і шэрагу іншых "градаў" на тэрыторыі Старажытнай Русі. Адпаведна ў расійскай і беларускай гістарыяграфіях з'явіліся абагульняльныя працы, у якіх закраналіся пытанні ролі і месца асобных земляў Старажытнай Русі ў дзяржаватворчых працэсах.

У расійскай гістарыяграфіі такой абагульняльнай навуковай працай стала калектыўная манаграфія "*Русь в IX—X веках: археологическая панорама*" [11]. У гэтым выданні расійскія калегі не пакінулі незаўважанымі дасягненні беларускай археалогіі, аднак падалі гэта са свайго пункта гледжання: першынство ў дзяржаватворчых працэсах яны аддалі Ноўгараду. Полацку, якому ўжо нельга было адмовіць у існаванні ў 862 г., была адведзена другарадная роля. Такая выснова была аспрэчаная намі ў артыкулах "*Полацк IX—XI стагоддзяў: шлях да дзяржаўнасці*" і "*Полацк і Полацкая зямля ў IX—X стагоддзях: вытокі беларускай дзяржаўнасці*", дзе акрэслена асноўная думка, што шляхі і формы станаўлення дзяржаўнасці на тэрыторыі Старажытнай Русі маглі быць рознымі [12; 13]. Была абгрунтавана высновa аб генезісе полацкай дзяржаўнасці на мясцовай славянскай (крывіцкай) аснове. Падкрэслена, што першы вядомы з летапісаў полацкі князь Рагвалод абапіраўся пераважна на мясцовую дружыну, аснову будучага полацкага баярства, паколькі колькасна матэрыяльная культура скандынаваў (вікінгаў) у полацкіх помніках археалогіі IX—X стст. значна саступае сінхронным помнікам Ноўгарада (Рурыкава гарадзішча) ці Ладагі. Такім чынам, фарміраванне Полацка як дзяржаўнага цэнтра на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў XI ст. працягвалася на той жа славянскай аснове.

Полацк у XI ст. становіцца не проста горадам у сацыяльна-эканамічным разуменні гэтага тэрміна, але з'яўляецца буйнейшым на тэрыторыі Старажытнай Русі: яго плошча перавышала памеры гарадоў Ноўгарада і Кіева. Пры гэтым прысутнасць скандынаўскіх рэчаў,

выяўленых археолагамі ў Полацку на Верхнім замку і Рагвалодавым гарадзішчы, па-ранейшаму была не такой заўважнай і вялікай, як у згаданых вышэй гарадах. Такой яна застаецца і зараз. Прыведзена меркаванне, што пачатковы Полацк у тапаграфічным плане не меў переваг перад аналагічнымі пасяленнямі на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, напрыклад Віцебскам і Лукомлем, таму прычынай імклівага развіцця Полацка як месца размяшчэння княжацкай адміністрацыі магла стаць яго наближанасць да балта-славянскай мяжы. Гэтая мяжа пазней была замацаваная парубежнымі полацкімі фартэцыямі і фарпостамі Браслаў, Рацюнкі, Маскавічы, Герцыке і Кукенойс.

Сфарміраваная айчынная навуковая школа дазволіла ў 2012 г. правесці ў Полацкім дзяржаўным універсітэце міжнародную канферэнцыю з унушальнымі навуковымі вынікамі. Так, у прадмове зборніка матэрыялаў канферэнцыі пяра дырэктара Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі В.В.Даніловіча і загадчыка цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі В.М.Ляўко прагучаў новы для беларускай гістарыяграфіі тэзіс. Прывядзем яго цалкам: “*Калі прааналізаваць і падагульніць вялізныя абгрунтаваныя і не вельмі ўзаемныя прэтэнзіі поўначы (Расіі) і поўдня (Украіны) адносна пальмы першынства ва ўтварэнні дзяржавы на тэрыторыі Усходняй Еўропы, трэба адзначыць, што абодва бакі не згадваюць аб самастойных кроках, якія распачыналіся ў гэтым напрамку цяперашнімі беларускімі землямі (тэрыторыя Полацкага княства) адначасова з Ноўгарадам і Кіевам. У запале доказаў, хто больш правы і варты вяршэнстваваць у фарміраванні дзяржаўнасці, абодва славянскія браты беларускага народа са здзіўленнем адзначаюць, што паміж Ноўгарадам і Кіевам у перыяд складання тэрыторый гэтых палітычных структур знаходзіўся Полацк, “спрэчны” і “стратэгічна важны” для кіраўнікоў поўначы і поўдня. Трэба канстатаваць, што такім ён заставаўся на працягу ўсяго старажытнарускага перыяду. Накіраваўшыся насустрач адна другой, дзве плыні славян зліліся на нашай тэрыторыі яшчэ ў VII—VIII стст. для таго, каб у IX ст. тут з’явіўся трэці прэтэндэнт на фарміраванне дзяржаўнасці ва Усходняй Еўропе*” [14, с. 8].

Прыведзенае заключэнне пра славянскую перадаснову першага насельніцтва летапіснага Полацка з’явілася невыпадкова. Дагэтуль намі паводле стратыграфічных даных вывучэння культурнага пласта і радыевугляроднага датавання быў абгрунтаваны час засялення славянамі полацкага гарадзішча напрыканцы VIII ст. на месцы летапіснага “града” [15]. А ў 2009 г. археолагам М.Клімавым на Рагвалодавым гарадзішчы ў культурным пласце быў знойдзены скарб куфіцкіх дырхемаў і атрыманы нумізматычныя доказы пацвярджэння летапіснай даты заснавання Полацка [16].

*Рэзкае павелічэнне плошчы Полацка ў XI ст. адбываецца за кошт разгалінавай сеткі пасадаў. Найбольш цікавыя археалагічныя адкрыцці былі зроблены намі на Запалоцкім пасадзе. У XI ст. на гэтым месцы пражывалі баяры, прадстаўнікі княжацкай адміністрацыі [17]. Верагодна, што менавіта тут пасля забойства Рагвалода мог размяшчацца двор намесніка Уладзіміра Святаславіча [18]. Аднак раскопкі на Запалоцкім пасадзе дазволілі прыадчыніць яшчэ адну таямніцу, звязаную з жыццём у Полацку нашага славутага земляка, першадрукара Францыска Скарыны. Археалагічныя сведчанні пачатковай вучэльні Скарыны ў Полацку знойдзеныя намі пад час археалагічных раскопак у 2010—2011 гг. [19]. Былі выяўлены драўляныя рэшткі пабудоў бернардзінскага кляштара 1498—1563 гг. з разваламі печаў і комплексам розных рэчаў. І хаця Полацк не стаў месцам выдання Скарынам першых кніг Біблії, ён стаў месцам нараджэння, пачатковага навучання і крыніцай творчага натхнення славутага палачаніна.*



*Фрагмент фрэскі з бернардзінскага касцёла ў Вільнюсе з выявай Запалоцкага пасада ў Полацку і бернардзінскага кляштара (будынкі за брамай). Першая палова XVI ст. Фота В.Глінніка.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# *Да пытання аб ролі і месцы Полацка ў дзяржаватворчых працэсах на тэрыторыі Беларусі*

Гістарыяграфічны агляд дасягненняў полацкай археалогіі на старонках "Беларускага гістарычнага часопіса" не будзе поўным без згадкі яшчэ адной важнай акалічнасці. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ёсць два калектыўныя выданні з аднолькавай назвай: "*Гісторыя беларускай дзяржаўнасці*", але з адрозным сутнасным напаўненнем. Першае выданне — акадэмічнае, падрыхтаванае аўтарскім калектывам пад кіраўніцтвам акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А.А.Кавалені, другое выданне — вучэбны дапаможнік — падрыхтаванае пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта НАН Беларусі І.А.Марзалюка, рэкамендаванае Рэспубліканскім саветам па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і разлічанае на студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі [20; 21].

У рэцэнзіі на акадэмічнае выданне на старонках "Беларускага гістарычнага часопіса" намі былі адзначаны станоўчыя моманты ў адлюстраванні працэсу станаўлення дзяржаўнасці Полацкай зямлі [22]. Разам з тым былі выказаны асобныя меркаванні і канкрэтныя прапановы для больш поўнага раскрыцця асаблівасцяў працэсаў дзяржаваўтварэння, якія пазней былі адлюстраваныя намі на старонках вучэбнага дапаможніка [21, с. 22—51].

Так, у "Гісторыі беларускай дзяржаўнасці" для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь намі былі пазначаны важныя тэзісы пра тое, што дынастычная прыналежнасць стала асноўным фактарам замацавання правячага княжацкага роду на землях Старажытнай Русі і адпаведна з'яўлялася вырашальным фактарам яе дзяржаўнай арганізацыі. Вялікім князем кіеўскім Уладзімірам Святаславічам (978—1015 гг.) была замацавана перадача ўлады князя па старшынстве, вонкавым сімвалам рэпрэзентацыі ўлады правячай дынастыі Рурыкавічаў стаў трызуб [21, с. 26—33]. Трызуб выкарыстоўвалі і полацкія князі як сімвал прамога датычэння да спадчыны Уладзіміра Святаславіча. Гэтак жа полацкімі князямі былі пераняты і княжацкія хрысціянскія культы, напрыклад культ Барыса і Глеба, а таксама традыцыі пахавання ў асобных княжацкіх магільнях [22, с. 6].

Яскравае адрозненне полацкага княжацкага дома заключалася ў наяўнасці ўласнай княжацкай дынастыі Рагвалодавічаў, улада ў якой перадавалася ад бацькі да сына, і дзякуючы гэтаму да XVI ст. за Полацкай зямлёй у летапісах замацавалася назва "Рагвалодаўшчына" [21, с. 29—30]. Калектыўная памяць полацкіх князёў Рагвалодавічаў таксама ўяўляе сабой выразную дзяржаўную самаідэнтыфікацыю. Яе наглядным прыкладам з'яўляецца наяўнасць унікальных і рэдкіх імёнаў князёў, не характэрных для агульнарускага антрапанімікона: імя першага полацкага князя Рагвалода, родапачынальніка полацкай дынастыі, знаходзілася ў выкарыстанні выключна полацкіх князёў. Сярод найбольш распаўсюджаных імёнаў былі Усяслаў і Брачыслаў. Калектыўная памяць полацкіх князёў перадавалася праз імёны родапачынальніка дынастыі Рагвалода, а таксама знакавых асоб полацкай сярэдневяковай гісторыі — Брачыслава Ізяславіча (1003—1044 гг.) і Усяслава Брачыславіча (1044—1101 гг.), пры якіх Полацкае княства дасягнула вяршыні сваёй магутнасці [21, с. 30].

У айчыннай гістарыяграфіі па-ранейшаму дыскусійным застаецца пытанне аб назвах першых дзяржаўных утварэнняў: "Старажытная Русь" ці "Кіеўская Русь". Спроба "абысці" абодва гэтыя тэрміны была зроблена на старонках акадэмічнага выдання "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці". Тады аўтарскі калектыў на чале з В.Ляўко разглядаў пачаткі дзяржаўнасці на Беларусі скрозь прызму гісторыі дзвюх "земляў": Полацкай і Кіеўскай. Пры гэтым тэрмін "Старажытная Русь" адмыслова не выкарыстоўваўся. Полацкая зямля мела рысы самастойнасці, а ў палітычную арбіту Кіеўскай зямлі, на думку аўтараў, уваходзілі землі Тураўскага княства, Беларускага Панямоння, Пасожжа і Пабужжа [20].

На наш погляд, адмаўляць тэрмін "Старажытная Русь" неправамоцна. Русь, Руская зямля — гэта канфесіонім (прыналежнасць да Рускай = Кіеўскай мітраполіі) і палітонім (дзяржаўна-генеалагічная агульнасць, створаная Рурыкавічамі) [21, с. 26]. Полацкая княжацкая дынастыя хаця і мела яскравыя рысы самаідэнтыфікацыі, але ж пры гэтым ушаноўвала гістарычную памяць аб Уладзіміры Святаславічы і не аддзяляла сябе ад этнаканфесійнай і культурнай прасторы Старажытнай Русі. Ад старэйшага сына Уладзіміра Святаславіча і полацкай князёўны Рагнеды Ізяслава Уладзіміравіча (каля 989—1001 гг.) полацкія князі пачалі перадаваць сваю ўладу ад бацькі да сына па дынастычнай лініі.

Дуалізм самаідэнтыфікацыі дынастычнай прыналежнасці полацкіх князёў акрэслены праз іх гістарыяграфічную назву — Ізяславічы — і летапісную — Рагвалодавічы. У сувязі з гэтым яшчэ раз згадаем палеміку на старонках спецвыпуска расійскага навуковага гістарычнага часопіса "*Родина*" (да 1150-годдзя расійскай дзяржаўнасці) і коратка раскрыем яе змест. Гэтая палеміка ў 2012 г. наглядна вызначыла розніцу падыходаў тагачаснай расійскай і ўкраінскай гістарыяграфій да прадмета пачаткаў Старажытнай Русі. Так, аўтарытэтны расійскі археолаг, доктар гістарычных навук Анатоль Мікалаевіч Кірпічнікаў акрэсліў першыя "паэтапныя сталіцы" Старажытнай Русі — гэта Ладага, Ноўгарад (Праноўгарад — Рурыкава гарадзішча), Кіеў [23, с. 24]. Гэтаму меркаванню супрацьпастаўлены погляд вядомага ўкраінскага археолага, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Украіны М.Ф.Катляра. Паводле яго, пачатак дзяржавы павінен быць звязаны з прыходам князя Алега ў Кіеў у 882 г. [24, с. 73]. Летапісны князь Рурык з'яўляецца міфічнай фігурай, а ў спробах "прывязаць" яго асобу да таго ці іншага археалагічнага аб'екта, па яго словах, "таится дьявол" [24, с. 73]. Фактычна абодва гэтыя погляды, за якімі стаяць і іншыя вядомыя гісторыкі, змагаюцца за першынство паняццяў "Наўгародская Русь" і "Кіеўская Русь".

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




*Расійскі гістарычны часопіс “Родина”. 2012, № 9.*




*Публікацыі даследчыкаў полацкай дзяржаўнасці на старонках “Беларускага гістарычнага часопіса”.*

Сёння, больш чым праз дзесяцігоддзе, навуковая палеміка паміж расійскімі і ўкраінскімі гісторыкамі па зразумелых прычынах перапынілася. З нашага пункта гледжання, існаванне трох складовых частак Старажытнай Русі — Русі Кіеўскай, Наўгародскай і Полацкай — перакрэслівае неабходнасць спаборніцтва за права першынства ў працэсе дзяржаўнага будаўніцтва ва Усходняй Еўропе, бо ўсе тры складовыя часткі мелі своеасаблівыя рысы станаўлення і развіцця, але былі і моцна з’яднаныя. Для беларускай гістарыяграфіі падаецца абсалютна абгрунтаваным выкарыстанне назвы “Полацкая Русь”. Такі падыход у сучаснай беларускай медыевістыцы ўжо знайшоў практычнае адлюстраванне. Прыкладам з’яўляецца рэзалюцыя семінара Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь на тэму “*Рэспубліка Беларусь: ад вытокаў да сучаснасці (гістарычны шлях дзяржаўнага будаўніцтва)*” (25 студзеня 2023 г.). На гэтым семінары з удзелам прадстаўнікоў вядучых сацыяльна-палітычных інстытутаў краіны і сферы адукацыі былі замацаваны канцэптуальныя рашэнні ў нацыянальнай гістарычнай палітыцы. Так, у дакладзе “*Першыя гістарычныя формы беларускай дзяржаўнасці — Полацкае і Тураўскае княствы*” аўтарам дадзенага артыкула было адзначана, што тэрмін “Полацкая зямля” ў IX—XIII стст. раўназначны тэрміну “Полацкая Русь”, якая мела рысы палітычнай суб’ектнасці нароўні з Наўгародскай Руссю і Кіеўскай Руссю. А гэта азначае, што гістарычная спадчына старажытных палачан, наўгародцаў і кіеўлян у праекцыі на сённяшні дзень нагадвае нам аб адзіным усходнеславянскім кораню трох народаў — беларусаў, расіян і ўкраінцаў — і аб агульнахрысціянскіх купелях Заходняй Дзвіны, Волхава і Дняпра [25, с. 5].

Дадзеная выснова, зробленая ў тым ліку на падставе археалагічных даследаванняў Полацка і Полацкай зямлі, была адлюстраваная ў рэзалюцыі семінара, у якой адзначана, што:

- першымі гістарычнымі формамі беларускай дзяржаўнасці з’яўляліся Полацкае і Тураўскае княствы;
- хрышчэнне Русі ў 988 г. абумовіла культурны і светапоглядны выбар нашых продкаў, заснаванне Полацкай епархіі ў 992 г. стала важнай вяхой гэтага працэсу;
- гуманістычныя погляды Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага садзейнічалі фарміраванню беларускага этнасу і шмат у чым прадвызначылі цывілізацыйны выбар беларускага народа;
- сістэма кіравання Полацкай зямлёй і традыцыі народаўладдзя Полацкага веча аказалі значны ўплыў на сацыяльна-палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага як аднои з гістарычных формаў беларускай дзяржаўнасці, якая ўзнікла на аснове земляў сучаснай Беларусі і Літвы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

У завяршэнне хацелася б адзначыць, што працяг археалагічнага вывучэння Полацка прынясе нямала цікавых і важных адкрыццяў. На сённяшні дзень археалагічныя крыніцы з'яўляюцца адным з надзейных рэсурсаў спасціжэння мінулага Полацкай зямлі. Усведамленне ролі і месца Полацка ў гістарычнай прасторы Старажытнай Русі яшчэ патрабуе далейшага асэнсавання. А гэта значыць, што ў працэсе спасціжэння і вызначэння ролі і месца беларускіх земляў у карціне свету ўсходніх славян IX—XIII стст. абавязкова будуць прачытаны новыя старонкі.


1. Дук, Д. Пячатка Еўфрасінні Полацкай / Д. Дук, І. Калечыц, А. Коц // Беларускі гістарычны часопіс. — 2015. — № 7. — С. 13—18.

2. Дук, Д. Парадная пячатка Еўфрасінні Полацкай / Д. Дук, І. Калечыц, А. Коц, Я. Торшын // Беларускі гістарычны часопіс. — 2017. — № 9. — С. 4—8.

3. Торшын, Я. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015 года / Я. Торшын, Д. Дук, А. Коц, А. Іаанісян, П. Зыкаў // Беларускі гістарычны часопіс. — 2016. — № 7. — С. 5—16.

4. Торшын, Я. Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку: вынікі архітэктурна-археалагічных даследаванняў 2017 года / Я. Торшын, Д. Дук, П. Зыкаў, А. Коц // Беларускі гістарычны часопіс. — 2019. — № 2. — С. 28—34.

5. Полацк у святле станаўлення гістарычных і нацыянальных форм беларускай дзяржаўнасці (IX—XX стст.) : манаграфія / Д. У. Дук [і інш.]. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2019. — 132 с.

6. Дук, Д. Станаўленне Полацка ў IX—XIII стст. / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. — 2007. — № 11. — С. 25—31.

7. Дук, Д. У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Вып. 21. Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка) — Мінск, 2011. — С. 30—60.

8. Дук, Д. Ад Рагвалода да Івана Грознага: Верхні замак у сацыяльнай тапаграфіі Полацка / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. — 2010. — № 5. — С. 8—12.

9. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк (IX—XIII вв.) / Г. В. Штыхов. — Минск : Наука и техника, 1975. — 136 с.

10. Тарасаў, С. В. Полацк IX—XVII стст. : гісторыя і тапаграфія / С. В. Тарасаў. — Мінск : Беларуская навука, 1998. — 183 с.

11. Русь в IX—X веках: археологическая панорама / Ин-т археологии РАН; отв. ред. Н. А. Макаров. — М. ; Вологда : Древности Севера, 2012. — 496 с., ил.

12. Дук, Д. Полацк IX—XI стагоддзяў: шлях да дзяржаўнасці / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. — 2012. — № 5. — С. 4—8.

13. Дук, Д. Полацк і Полацкая зямля ў IX—X стагоддзях: вытокі беларускай дзяржаўнасці / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. — 2013. — № 11. — С. 5—9.

14. Даніловіч, В. Прадмова / В.Даніловіч, В. Ляўко // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэр. Міжнар. навук. канф. (Полацк, 22—23 мая 2012 г.) / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі, Полацкі дзярж. ун-т ; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; навук. рэд., уклад. В. М. Ляўко. — Мінск : Беларус. навука, 2012. — С. 7—9.

15. Дук, Д. Старажытныя славяне Полацкага гарадзішча (780—1310 гг.) / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. — 2008. — № 7. — С. 21—27.

16. Клімаў, М. Новае адкрыццё ў храналогіі старажытнага Полацка / М. Клімаў // Беларускі гістарычны часопіс. — 2010. — № 5. — С. 5—7.

17. Дук, Д. Палата, Запалоцце, Полацк — пачатак сярэдневяковага горада / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. — 2007. — № 3. — С. 33—36.

18. Дук, Д. В. Новые археологические исследования на территории Заполотского посада древнего Полоцка (конец X — первая половина XII в.) / Д. В. Дук, А. Л. Коц // Stratum plus. Archaeology and Cultural Anthropology : Санкт-Петербург, Кишинёв, Одесса, Бухарест. — 2013. — № 5. — С. 83—90.

19. Дук, Д. Да пытання аб пачатковым навучанні Скарыны: матэрыяльныя сведчанні бернардзінскага кляштара ў Полацку 1498—1563 гг. / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. — 2018. — № 11. — С. 19—25.

20. История белорусской государственности. В 5 т. Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома : О. Н. Левко, В. Ф. Голубев ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. — Минск : Беларуская навука, 2018. — 598 с.

21. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік / І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін [і інш.] / пад агульнай рэд. І. А. Марзалюка. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. — 448 с.

22. Дук, Д. Нашчадкі Рагвалода і пачаткі дзяржаўнасці на беларускіх землях: разважанні да першага тома "Гісторыі беларускай дзяржаўнасці" / Д. Дук, Ю. Кежа // Беларускі гістарычны часопіс. — 2020. — № 2. — С. 3—8.

23. Кирпичников, А. Государственности России — 1150! / А. Кирпичников // Родина. — 2012. — № 9. — С. 23—24.

24. Котляр, Н. Начало Руси, или споры вокруг 862 года / Н. Котляр // Родина. — 2012. — № 9. — С. 70—73.

25. Осипов, М. Почему Полоцкая земля — синоним Полоцкой Руси? / М. Осипов // СБ — Беларусь сегодня. — 26.01.2023. — № 16 (26667). — С. 5.


*Паступіў у рэдакцыю 06.02.2023.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова